ГЦБС г.Гродно

Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу



# "Быць карысным людзям"

## Да 90-годдзя з дня нараджэння А.Н. Карпюка

2010

# *Прадмова*

***Для чаго чалавек жыве?***
***Мабыць, для барацьбы за Праўду.***
***А. Карпюк***

Археолаг Міхась Ткачоў, біяхімік Юрый Астроўскі, краязнаўца Апанас Цыхун, кампазітар Аляксандр Шыдлоўскі, пісьменнік Аляксей Карпюк… Гродна ў пасляваенныя дзесяцігоддзі шанцавала на вартых людзей. Але і сам Гродна шмат у чым рабіў іх такімі, якімі яны ўжо навечна ўвойдуць у Беларускі Пантэон.

Аляксей Карпюк быў і застаўся беларускім пісьменнікам, сумленным чалавекам, які меў права сказаць: “Пісанне стала маім лёсам. Я знайшоў спосаб, як найбольш быць карысным людзям. Я спазнаў шчасце, я ведаю, як мне жыць!”

Усё жыццё гэты чалавек не ўпісваўся ў афіцыйны фармат эпохі. На кожнай пасадзе Карпюк вызначаўся прынцыповасцю, няўрымслівай ініцыятыўнасцю, таму нярэдка быў вельмі не даспадобы бюракратам розных узроўняў. Аднак было ў пісьменніка тое, што да гэтай пары выклівае павагу і нават захапленне – максімальна сумленныя адносіны да даручанай справы, вернасць уласным ідэалам і прынцыпам.

Як асоба Карпюк быў дынамічна-імпульсіўны, нечаканы ў сваіх учынках і паводзінах. У 1966 г. Карпюк выступіў на V з’ездзе беларускіх пісьменнікаў з прамовай, у якой сцвярджаў права літаратара на праўдзівы паказ жыцця, адвяргаў адміністраванне ў літаратуры. Як заўсёды, ён не быў галаслоўным, а аргументаваў свае высновы фактамі, называючы імёны канкрэтных асобаў, якія былі тады пры ўладзе. Пасля гэтага адбылося тое, што і павінна было адбыцца: органы ідэалагічнага нагляду пачалі “напрацоўваць кампрамат” на пісьменніка, яму прыпісвалася супрацоўніцтва з гестапа, здрадніцтва і іншыя грахі… Жыццёвая вытрымка дапамагла пісьменніку вынесці гэтае цяжкае выпрабаванне. Але перажытае далося ў знакі: А. Карпюк памёр 14 ліпеня 1992 г. ад рака, у час, калі нарэшце з’явілася магчымасць адкрыта гаварыць праўду і не баяцца праследаванняў.

Карпюка няма з намі ўжо васемнаццаць гадоў. Нябачна больш яго постаці, якая шпарка крочыць да дома Элізы Ажэшкі. Ня ўбачаць больш ніколі гродзенцы яго суровага твару з саліхвацкім чубам. Гродна патрабуе вуліцу Карпюка, школу, літаратурную

прэмію імя Карпюка. Гродна, як і ўся Беларусь, патрабуе новых Рыцараў Сумлення, такіх, як Аляксей Карпюк.

Да юбілею А.Н. Карпюка прапануем бібліятэкам наступныя матэрыялы:

- *Біяграфічную даведку;*
- *Прыклады назваў юбілейных выстаў;*
- *Бібліяграфічны агляд твораў пісьменніка;*
- *Сцэнарый вечарыны – партрэта;*
- *Бібліяграфічны спіс літаратуры аб ім.*

## Біяграфічная даведка



Карпюк Аляксей Нічыпаравіч нарадзіўся 14.04.1920 г. у вёсцы Страшава на Беласточчыне (цяпер Польшча) у сялянскай сям'і.

Скончыў два класы польскай гімназіі ў Вільні. У 1939-1941 гг. вучыўся ў Наваградскай педагагічнай навучальні. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі ўваходзіў у склад падпольнай дыверсійнай групы. У час выканання дыверсіі на чыгунцы ў канцы 1942 г. быў арыштаваны і адпраўлены ў Беластоцкую турму, а адтуль у канцлагер Штутгоф. Увосень 1943 г. уцёк з лагера і прыняў удзел у партызанскай барацьбе. У 1944 г. быў камандзірам партызанскага атрада імя К. Каліноўскага на Гарадзеншчыне. У 1944-1945 гг. служыў у Савецкай Арміі, удзельнічаў у баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі. Двойчы паранены. Скончыў аддзяленне англійскай мовы Гродзенскага педагагічнага інстытута (1949). Працаваў загадчыкам Сапоцкінскага РАНА (1949-1951), дырэктарам Біскупцкай сямігадовай школы Ваўкавыскага раёна (1951-1953), у Гродзенскім пединстытуце (1953-1955), у абласной газеце «Гродзенская праўда» (1955-1957), уласным карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва». У 1961 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З 1961 г. – загадчык агенцтва «Інтурыст» (Гродна), з 1965 г. – сакратар Гарадзенскага абласнога аддзялення СП БССР, з 1970 г. – упаўнаважаны УААП па вобласці, у 1977-1981 гг. – дырэктар Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі ў Гродна, з 1978 г. – зноў сакратар Гродзенскага

абласнога аддзялення СП БССР. Сябра СП СССР з 1953 г. Жыў з 1953 г. ў Гродна.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі і залатым крыжам ордэна «Віртуці Мілітары» (Польшча). Заслужаны работнік культуры БССР (1980).

Памёр 14.07.1992 г.

У друку дэбютаваў у 1953 г. аповесцю «У адным інстытуце». Выйшлі кнігі аповесцей і апавяданняў «Дзве сасны» (1958), «Данута» (1960), «Мая Гродзеншчына» (нарыс, 1960), «Пушчанская адысея» (1964), «Чаго мы варты» (бібліятэка газеты «Голас Радзімы», 1970), «След на зямлі: Скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны» (1972), «Вершалінскі рай» (1974), «Ольга Корбут» (1977), «Свежая рыба» (1978), «Партрэт» (1983), «Сучасны канфлікт» (1985), «Дзве сястры» (казка, 1986), раман «Карані» (1988). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах у 1980 г. і 1990-1991 гг.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1986) за кнігу «Сучасны канфлікт».

## *Творы А.Н. Карпюка*











| | |
|---|---|
| “У адным інстытуце” | (1953) |
| “Дзве сасны” | (1958) |
| “Данута” | (1960) |
| “Мая Гродзеншчына”(нарыс) | (1960) |
| “Пушчанская адысея” | (1964, 2009) |
| “Чаго мы варты” | (1970) |
| “След на зямлі: Скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны” | (1972) |
| “Вершалінскі рай” | (1974) |
| “Вольга Корбут” | (1977) |
| “Свежая рыба” | (1978) |
| “Партрэт” | (1983) |
| “Сучасны канфлікт” | (1985) |

“Дзве сястры” (казка) (1986)
“Карані” (1988)
Выбраныя творы ў 2-х тамах (1980 і 1990-1991, 2007)
“Развітанне з ілюзіямі” (2008)

## *Выставы ў бібліятэках*

Пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею А.Н. Карпюка, прапануем арганізаваць ў бібліятэках выставы літаратуры. Прапануемыя назвы выстаў да 90–годдзя А.Н. Карпюка:

- “Урок жыцця і творчасці”;
- “Плён творчасці – дослед жыцця”;
- “Быць карысным людзям”;
- “Адысея праўдалюбца”;
- “Беларус, які хваляваўся за ўсіх”;
- “Ідучы да праўды”.

## *“Творы, якім верыш”:*
### *бібліяграфічны агляд твораў А. Карпюка*



Аляксей Карпюк адносіцца да тых пісьменнікаў, чыя творчасць народжана жыццём у самым прамым і непасрэдным сэнсе. Яна сваёй рэальнай асновай, падзеямі, высокай грамадзянскай мэтай з’яўляецца натуральным і неабходным працягам і выяўленнем самаго пісьменніцкага жыцця. Паводзіны творчыя і паводзіны жыццёвыя – для Карпюка адзіна непадзельнае, тут адно вынікае з другога, адно абмоўлена другім. Такое ў літаратуры сустракаецца далёка не заўсёды. Вырашальнае значэнне набываюць умовы фарміравання творчай асобы.

Умовы, у якіх прайшла маладосць будучага пісьменніка, былі надзвычай складаныя, насычаныя неверагоднымі выпрабаваннямі. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі ён уваходзіў у склад падпольнай дыверсійнай групы. Быў арыштаваны, апынуўся ў

канцэнтрацыйным лагеры Штутгоф. Цудам уцёк адтуль. Актыўна змагаўся ў партызанскіх атрадах. Арганізаваў і ўзначаліў атрад імя К. Каліноўскага. З войскамі Савецкай Арміі прайшоў шлях ад Варшавы да Берліна. Быў паранены. Пасля вайны вучыўся ў інстытуце, настаўнічаў у вёсцы, быў журналістам… Гэтымі вехамі пазначаны жыццёвы шлях Аляксея Карпюка да пачатку творчасці.

Пачатак жа творчасці адносіцца да 1953 г., калі з’явілася аповесць “У адным інстытуце”. Аўтару тады пераваліла ўжо за 30. Але супастаўляючы ўсё напісанае Карпюком з ягонай біяграфіяй, бачым, што доўгі шлях у літаратуру для яго зусім не выпадковы – сам характар таленту патрабаваў гэтага. Пасля першай аповесці Карпюк стаў даволі вядомым у сваім горадзе чалавекам, аднак да права называць сябе пісьменнікам было яшчэ далёка.

Падзеі ўсіх твораў пісьменніка адбываюцца ў ягоных родных мясцінах, у тым кутку, дзе прайшло не заўсёды бестурботнае дзяцінства і драматычная маладосць. Куток гэты – паўночна-захадная частка Гродзеншчыны, часткова – паўночна-ўсходняя Беласточчына. Населены ён людзьмі розных нацыянальнасцяў, рознага веравызначэння.

Першыя пасляваенныя гады, нагоды і радасці, страшэнныя цяжкасці і каханне, спрэчкі пра сённяшні дзень і балючыя ўспаміны пра дзень мінулы – усё гэта складае змест твораў, якія ўвайшлі ў першую кнігу пісьменніка “Дзве сасны”.

Пазней Аляксей Карпюк пачынае ісці як бы ў глыбіню асабіста перажытага. Так нарадзілася аповесць “Данута”, якая прынесла аўтару сапраўдны поспех і шырокую вядомасць. У 1958 годзе гарадзенскае літаратурнае выданне “Нёман” надрукавала першы варыянт аповесці пад назвай “У маладыя гады”. Твор выдаваўся на рускай, украінскай, латышскай, польскай і чэшскай мовах. Аповесць вяртае чытача да падзей Вялікай Айчыннай вайны. Падзеі падаюцца як успаміны Янкі Барташэвіча – галоўнага героя, яд імя якога вядзецца апавяданне. Герой “Дануты” надзелены дапытлівым розумам, самастойнасцю мыслення, развітым пачуццём чалавечай годнасці. Жыццё грамадскае, суровае і гераічнае, падаецца ва ўспамінах героя як абставіны, умовы, у якіх расквітнела і згасла першае, прыгожае і рамантычнае, каханне. Увогуле, няшмат у нашай прозе знойдзем твораў, дзе б так лірычна, усхвалявана, на такой рамантычнай ноце было б расказана пра гэтае вялікае чалавечае пачуццё. “Гісторыя,

афарбаваная цнатлівасцю", сказаў пра "Дануту" гісторык і сябра пісьменніка Барыс Клейн. Гэта, мабыць, самая кароткая і трапная характарыстыка зместу і сэнсу раману.

У лёсе самаго пісьменніка, у лёсе ягоных герояў падзеі Вялікай Айчыннай займаюць асаблівае месца. І вельмі праўдзівае, глыбокае адлюстраванне знайшлі яны ў аповесці "Пушчанская адысея" (1964). У лёсе галоўнага героя Алеся Кучынскага вельмі выразна высвечвецца лёс самога аўтара. У "Пушчанскай адысеі" няма шырокіх, разгорнутых карцін партызанскай барацьбы, мала месца адведзена апісанню баявых аперацый. Увага пераважна скіравана на высвятленне складанага, супярэчлівага працэсу станаўлення і разгортвання ўсенароднага супраціўлення ворагу. Таму пісьменнік значнае месца адводзіць паказу жыцця сялян ва ўмовах акупацыі, паказу партызанскіх будняў. Партызанская вайна, якой яна паказана ў Карпюковай аповесці, - вайна народная. Паказана яе складанасць, яе стыхійны ў многіх адносінах характар, паказана ўнутраная неабходнасць узнікнення яе ў тых абставінах варожага нашэсця.

Пасля аповесці "Пушчанская адысея" Аляксей Карпюк імкнецца як бы адысці ад падзей, непасрэдна ўзятых з асабістага жыццёвага вопыту. Яго ўсё больш пачынае цікавіць мінулае тых людзей, сярод якіх ён непасрэдна жыве – няпростая гісторыя працаўнікоў роднай зямлі. Так нараджаюцца два зусім супрацьлеглыя творы: аповесць-хроніка "Па кветку шчасця" і раман-быль "Вершалінскі рай".

"Вершалінскі рай" (1972) – раман-быль. Пісьменнік расказвае пра авантуру саматужнага прарока Гальяша Клімовіча, цемрашальства сектантаў. Але, даследуючы гэту авантуру, паказваючы яе шматлікіх удзельнікаў, Карпюк здолеў выявіць яе сацыяльныя і духоўныя вытокі, тую глебу, на якой могуць узнікаць падобныя антычалавечыя з'явы.

У рамане "Карані" (1988) пісьменнік звяртаецца да праблемаў сучаснасці. Сюжэт раману просты – дзеці, што хочуць купіць сабе машыны, забіраюць старога бацьку з вёскі ў горад і прадаюць хату, дзе яны выйшлі на свет. Вось так проста дзеці адмаўляюцца ад спадчыны сваіх продкаў. Бяз суму і засцярогаў выкідаюць на сметніцу гісторыі ня толькі вытканыя маці рушнікі, але і складзеныя дзедамі песні, мову, традыцыі.

Аўтабіяграфічная аповесць “Развітанне з ілюзіямі” ўбачыла свет у 2008 годзе ў серыі “Гарадзенская бібліятэка”. Твор гэты спачатку быў пражыты і перажыты А. Карпюком. Па сутнасці, усім яго свядомым жыццём. Напісаны ў канцы жыцця: 1989-1990 гг. Твор прынцыпова важны, у жыцці (да і ў творчасці) выніковы, балючы. Развітанне ў ім выпакутаванае. Развітанне з КПСС, з яе ідэаламі, яе маральнымі прынцыпамі, з тым, чаму верыў многія гады, за што па-свойму змагаўся многія гады. “Развітанне з ілюзіямі” – твор, які расказвае пра самае балючае, выпакутаванае самім пісьменнікам, народам, пра глыбокія расчараванні, незагойныя раны, страты. Успрымаецца гэты твор не толькі як сведчанне гісторыі, мінулага, але і як урок творчасці, мастацкага спасціжэння рэчаіснасці, урок жыццёва і творчы пакутлівы, але сумленны.

Ідэйны напал, праўдзівасць, нязменнае рамантычнае імкненне да праўды, святла і прыгажосці – вось якасці, якія і сёння прываблiваюць у лепшых творах Аляксея Карпюка. Перачытваючы “сённяшнія” кнігі пісьменніка, яшчэ раз пераконваешся: літаратура, у аснове якой рэальнае жыццё рэальнага чалавека, нязменна ўключаецца ў плынь адвечнай людской памяці, уплываючы тым самым на індывідуальную чалавечую памяць.

## *“Быць карысным людзям”:*

### *сцэнарый вечарыны памяці з нагоды 90-годдзя пісьменніка Аляксей Нічыпаравіча Карпюка*

*“Пісанне стала маім лёсам.*
*Я знайшоў спосаб, як найбольш быць карысным людзям.*
*Я спазнаў шчасце, я ведаю, як мне жыць!”*
*А.Н. Карпюк*

*Сцэна ўпрыгожана з дапамогай партрэта (фота) пісьменніка і лічбы* ***90*** *на заднім плане. Выстаўка “Быць карысным людзям” размешчана на сцэне справа. Выстаўка фотадакументаў аб жыцці і творчасці пісьменніка з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага музею гісторыі рэлігіі і з сямейнага архіва. Злева на сцэне размешчаны экран, дзе падчас мерапрыемства*

*дэманструюцца фота- і відэадакументы аб жыцці пісьменніка. Гучыць лірычная мелодыя “Люблю мой край, старонку гэту” ў выкананні ГУК “Гродзенская капэла імя А. Тызенгаўза” ці ў запісу.*

**Вядучая:** Добры дзень, шаноўнае спадарства!

Як толькі даводзіцца ўсім нам адарвацца ад паўсядзённай мітусні і апынуцца сам-насам з сабою, усплываюць у памяці пераломныя ў летазлічэнні даты, і свет успрымаецца тады вечным і бясконцым. Як і да з’яўлення людзей на планеце ён існаваў, так і пасля адыходу кожнага з нас ён будзе развівацца – будуць загарацца на небе зоркі, свяціць сонца.

Дзьмуць вятры, імчацца аблокі… Зямля будзе жыць – і дзеі на ёй не перастануць разгортвацца. А мы… адшумім, праляцім знічкаю над краем, асветлім яго сваёй дзейнасцю – і растворымся ў прасторы. Вечнасць Сусвету і кароткачасовасць існавання кожнага з нас…

Аднак з драбнюсенькіх кропелек складваецца акіян, і несмяротнасць чалавецтва вырастае з дзейнасці кожнай асобы. Асабліва, калі гэта яркая і таленавітая, неардынарная асоба. Сёння мы сабраліся, каб аддаць даніну памяці такой асобе ў гісторыі культуры краіны, нашаму слаўнаму земляку, пісьменніку Аляксею Нічыпаравічу Карпюку, якому ў гэтыя цудоўныя вясеннія дні спаўняецца 90 гадоў… Ён мог бы адзначыць сёння сваю 90-гадовую вясну разам з намі. Толькі ўжо 18 гадоў няма з намі гэтага неардынарнага, таленавітага чалавека. Але творы яго і памяць аб ім жывыя. Імя яго назаўсёды ўпісана ў літаратуру і культуру Беларусі.

Для адкрыцця вечарыны памяці, прысвечанай 90-годдзю Аляксея Нічыпаравіча Карпюка, запрашаем да мікрафону прадстаўніка мясцовай улады...

*(Выступленне прадстаўніка мясцовай улады).*

**Вядучая:** Юбілей Аляксея Нічыпаравіча Карпюка не толькі важная падзея ў жыцці нашага горада і нашай краіны. Гэта таксама адметная і светлая дата для яго блізкі і родных людзей. На жаль, 28 верасня 2008 году перастала біцца сэрца Іны Анатольеўны Карпюк, жонкі Аляксея Нічыпаравіча. Мы схіляем сёння галавы і аддаем даніну павагі перад Пісьменнікам і перад яго вернай спадарожніцай, - той, што стала значнай часткай яго бібяграфіі,

займала светлае месца ў яго сэрцы і душы. Ім сёння словы памяці і павагі, словы ўдзячнасці і пашаны.

Гучыць адна з любімых мелодый Аляксея Карпюка “Зорка Венера”.

*(Гучыць “Зорка Венера” у запісу ці*
*ў выкананні мясцовых выканаўцаў ).*

**Вядучая:** Вядома, час, у якім жыць, чалавек не выбірае. Аляксей Нічыпаравіч менавіта з тых пісьменнікаў, якія ўсе свае творы спачатку напісалі ўласным жыццём. Прайшоў ён немала складаных дарог, перанёс шмат неверагодных выпрабаванняў: незвычайных падзей на яго вяку было столькі, што цалкам хапіла б на 10 чалавек! У 1934 годзе 14-гадовы хлопчук трапіў пад суд за спробу ўцячы з панскай Польшчы ў СССР. У гады нямецка-фашыскай акупацыі ўваходзіў у склад падпольнай дыверсійнай групы. У 1943 годзе быў арыштаваны, апынуўся ў канцэнтрацыйным лагеры Штутгоф. Цудам уцёк адтуль. Актыўна змагаўся ў партызанскіх атрадах. Арганізаваў і ўзначаліў атрад імя К. Каліноўскага. З войскамі Савецкай Арміі прайшоў шлях ад Варшавы да Берліна. Быў паранены. Пасля вайны вучыўся ў інстытуце, настаўнічаў у вёсцы, быў журналістам, дырэктарам музею… Сёння мы ўспамінаем, асэнсоўваем, слухаем сэрцам і спыняемся каля некаторых старонак і карцін жыцця і творчасці пісьменніка. Як у вершы:

Кожны дзень з жыцця – карціна.
Карціна, намаляваная каляровымі альбо чорна-белымі фарбамі.
Пражытыя гады – шматлікія залы, дзе сабраныя гэтыя карціны.
У кожнага свая галерэя.
Эрмітаж, Трэццякоўка, Луўр.
Ці сціплы правінцыяльны музей.
Спынімся каля некаторых палотнаў жыцця
Незвычайных па сюжэце.
Яскравых па каларыце.

Спынімся каля карцін, якія пакінулі глыбокі след у жыцці…
Слова прадстаўнікам мясцовай інтэлігенцыі…

*(Тут можна прадстаыіць слова выкладчыку Гродзенскага дзяржаўнага універсітэту імя Я. Купалы, літаратуразнаўцы, пісьменніку і г.д.)*

**Вядучая:** Творчасць пісьменніка Карпюка – гэта заўсёды яго біяграфія, біяграфія яго душы. Судакрананне з ёй – заўсёды адкрыццё. Словы павагі захаплення яго асобай – гэта толькі невялікая частка даніны нашай пашаны гэтаму чалавеку. Аб старонках творчасці і жыцця пісьменніка гавораць нашы выставы кніг, публікацый і фотадакументаў. Пра старонкі жыцця і творчасці яго гаворыцца сёння ў гэтай зале.

*(Слова прадастаўляецца літаратурнаму крытыку)*

**Вядучая:** Па ўспамінах жонкі пісьменніка Іны Анатольеўны, Аляксей Нічыпаравіч любіў мілагучную беларускую народную песню, прыгожыя мелодыі менавіта свайго роднага краю. Паслухаем адну з любімых музычных твораў пісьменніка – “Паланэз” Міхаіла Клеафаса Агінскага.

*(Гучыць “Паланэз” М.К. Агінскага)*

**Вядучая:** У Аляксея Нічыпаравіча Карпюка заўсёды было шмат знаёмых і сяброў, аднадумцаў і саратнікаў. Усе, каго жыццё звяло з гэтым няўрымслівым чалавекам, адчувалі, як заўсёды, штодзённа, штачасна, жыве ён справамі і думкамі роднага горада.

*(Тут слова можна прадаставіць сябрам, пісьменніка, людзям, якія добра ведалі А. Карпюка)*

**Вядучая:** Немагчыма, каб напор творчага духу пісьменніка Карпюка А.Н. не абудзіў сучаснікаў да жыцця, да жадання тварыць, пісаць… ”Пісанне стала маім лёсам…” – напісаў ён у аўтабіяграфіі. Шмат пісьменнікаў і паэтаў Беларусі маглі б сёння разам з намі ўспомніць пра сустрэчы з ім. Гэта і Васіль Быкаў, і Янка Брыль, і Уладзімір Калеснік, І Максім Танк, і Данута Янаўна Бічэль…

*(Слова прадастаўляецца саратнікам Аляксея Карпюка па пяру – мясцовым паэтам, пісьменнікам)*

**Вядучая**: Памяці Аляксея Нічыпаравіча Карпюка прысвяцілі свае творы вядомыя людзі нашага горада. Я прапаную вашай увазе выступленне самадзейнага кампазітара, аўтара вакальна-харэаграфічных кампазіцый, музыкі да спектакляў, песень, рамансаў, гімнаў Петрашэвіча Яўгена Канстанцінавіча.

*(Выступленне Петрашэвіча Я.К. ці песня Петрашэвіча Я.К. ў выкананні мясцовых выканаўцаў)*

**Вядучая:** А зараз слова для паэтычнага выказвання даніны павагі пісьменніку-творцы, ад мастака-творцы, члену Саюза

мастакоў Беларусі, выдатнаму мастаку краіны Уладзіміру Васільевічу Церабуну.

*(Выступленне У.В. Церабуна)*

**Вядучая**: Непаўторнаму пісьменніку і чалавеку – пасвячэнне ад гродзенскага паэта Віктара Кудлачова.. Свой верш Віктар Сямёнавіч прысвяціў менавіта Аляксею Карпюку.

*(Выступленне В. Кудлачова).*

**Вядучая:** Як даніна павагі ад нашага горада А.Н. Карпюку, гучыць для нас сёння цудоўная музыка.

*(Выступленне музычнага ансамбля).*

**Вядучая:** Я думаю, сёння, успамінаючы пра вернага сына нашай беларускай зямлі, адданага яе працаўніка, шчырага і праўдалюбівага чалавека, слухаючы ўспаміны і ўражанні, меркаванні і думкі, мы ўсе нібыта адчулі, як цёплая і цвёрдая рука Аляксея Нічыпарваіча кранула нашы сэрцы і душы, як быццам ён нябачна прысутнічаў сёння з намі…

Ён гаворыць сёння з намі не асабіста, але праз свае творы…

Пройдуць гады, стагоддзі, кожае пакаленне паступова вытесніцца новым, маладым, - і жыццё будзе прадаўжацца. Яно бясконцае… Як памяць наша застанецца неўміручаю. Памяць пра Чалавека, Пісьменніка. Памяць аб самабытным і непаўторным творцы, сыне свайго краю і народу.

Вялікі дзякуй усім за ўвагу!

Аўтар сцэнарыя - Свірыда Н.Р.

# БІБЛІГРАФІЯ

## *Кнігі пісьменніка:*

Карпюк, А. Выбраныя творы: у 2-х т. / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. Т.1-2.

Карпюк, А. Выбраныя творы / Аляксей Карпюк. - Мінск: Кнігазбор, 2007. - 597 с. - (Беларускі кнігазбор. Серыя 1. “Мастацкая літаратура”).

Карпюк, А. Вершалинский рай: роман-быль / Алексей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура,1986. - 351 с.

Карпюк, А. В одном институте: повести / Алексей Карпюк. - Мінск: Беларусь, 1965. - 352 с.

Карпюк, А. Данута: повесть / Алексей Карпюк. - Мінск: Юнацтва, 1989. - 319 с. – (Библиотека юношества).

Карпюк, А. За цветком папоротника: повести и рассказы / Алексей Карпюк. - М.: Советский писатель, 1979. - 303 с.

Карпюк, А. Современный конфликт: повести, рассказы / Алексей Карпюк. - М.: Советский писатель, 1987. - 394 с.

Карпюк, А. Вершалінскі рай: аповесць / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1974. - 335 с.

Карпюк, А. Белая Дама: аповесці / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1992. - 447 с.

Карпюк, А. Дзве сястры: казка: для дашк. і мал. школ. узросту / Аляксей Карпюк. - Мінск: Юнацтва, 1986. - 16 с.

Карпюк, А. Карані: раман: для стар.шк. узросту / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1988. - 351 с.

Карпюк, А. Партрэт: аповесць, эсэ, нявыдум. гісторыі / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. - 270 с.

Карпюк, А. Пушчанская адысея: аповесць, апавяданні / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 2009. - 524 с. - (Беларуская проза XX стагоддзя).

Карпюк, А. Свежая рыба: аповесці і апавяданні / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1978. - 367 с.

Карпюк, А. След на зямлі: скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны / Аляксей Карпюк. - Мінск: Беларусь, 1972. - 111 с.

Карпюк, А. Сучасны канфлікт: аповесць, франтавы дзённік, не зусім гродзенскія гісторыі / Аляксей Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. - 317 с.

## *Літаратура аб жыцці і творчасці Аляксея Карпюка*

Карпюк Аляксей Нічыпаравіч // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1999. - Т. 8. - С. 98.

Карпюк Аляксей Нічыпаравіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. - Мінск, 1985. - Т. 2. - С. 695.

Аляксей Карпюк // Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. - Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. - Т. 3. - С. 181-188.

Беларускія пісьменнікі (1917-1990): даведнік / склад. А.К. Гардзіцкі: нав. рэд. А.Л. Верабей. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1994. - С. 266-267.

Адысея праўдалюбца: да 85-годдзя з дня нараджэння Аляксея Карпюка: (буклет) // Ваўкавыс. цэнтр. раён. б-ка, аддз. бібл. маркетынгу. - Ваўкавыск, 2005. - 9 с. - (Знакамітыя людзі Ваўкавышчыны).

Аляксей Нічыпаравіч Карпюк (1920-1992, Гродна) // Заслужаныя дзеячы і работнікі культуры Рэспублікі Беларусь Гродзеншчыны: зб. нарысаў. – Гродна: ОНМЦ, 1999. - С. 28-29.

Аневіч, А. Творы, якім верыш / А. Аневіч // Літаратура і мастацтва. - 2000. - 14 крас. - С. 12.

Андраюк, С. Старонкі лёсу і творчасці / С. Андраюк // Полымя. - 2003. - N6. - С.194-209.

Андраюк, С. Урок жыцця і творчасці / С. Андраюк // Літаратара і мастацтва. - 2009. - С. 15.

Андраюк, С.А. Пісьменнікі. Кнігі: літаратурна-крытычныя артыкулы: для ст. шк. узросту / С.А. Андраюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1997. - 317, [2] с.

Астраўцоў, С. Памяці А. Карпюка / С. Астраўцоў // Наша слова. - 2009. - 6 траўня. - С. 1.

Бічэль-Загнетава, Д. Вобраз светлы і незабыўны / Д. Бічэль-Загнетава // Гродзенская праўда. - 2000. - 15 крас. - С. 6.

Вашкевіч, А. "Больш за ўсё я люблю свабоду..." / А. Вашкевіч // Дзеяслоў. - 2007. - № 4. - С. 252-269.

Вядомыя і невядомыя знакамітасці-юбіляры Ваўкавышчыны 2005 года: рэкамендацыйны спіс літаратуры: да 1000-годдзя г. Ваўкавыска / Ваўкавыская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу. - Ваўкавыск, 2004. - 26 с.

Гавін, Т. Беларус, які хваляваўся за ўсіх / Т. Гавін // Биржа информ. (Гродно). - 2002. - 11 июля. - С. 7.

Гавін, Т. Лепшы сябра палякаў / Т. Гавін // Ніва (Беласток). - 2002. - 28 ліп. - С. 5.

Дзелянкоўскі, М. На скрыжаванні / М. Дзелянкоўскі // Гродзенская праўда. - 2000. - 15 крас. - С. 6.

Задаля, В. Ідучы да праўды: [лёс і дзейнасць А.Н. Карпюка] / В. Задаля // Ліатарата і мастацтва. - 1998. - 18 верасня (№38). - С. 16.

Задаля, В. "Якім быў, такім і запомніўся" / В. Задаля // Культура. - 2002. - 17-23 жн. - С. 12.

Ивановский, В. Пройдя сквозь ад, остался человеком / В. Ивановский // Перспектива (Гродн. р-н). - 2005. - 31 марта. - С. 17; 7 апр. - С. 17.

Іпатава, В. Успаміны пра Аляксея Карпюка / В. Іпатава // Наша слова. - 2006. - 24 траўня. - С. 10-11.

Калеснік, У. Плён творчасці - дослед жыцця / У. Калеснік // Карпюк, А. Збор твораў: у 2 т. / А. Карпюк. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1991. - Т. 1. - С. 5-22.

Калеснік, У.А. Усё чалавечае: літаратурныя партрэты, артыкулы, нарысы / У.А. Калеснік. - Мінск: Мастацкая літаратура, 1993. - 381 с.

Капітонава, І. Адысея праўдалюбца / І. Капітонава // Перспектива (Гродн. р-н). - 2005. - 14 апр. - С. 24.

Карпюк, І.А. І вершы пісаў, і суполкі ствараў / І.А. Карпюк // Наша слова. - 2005. - 26 кастр. - С. 8.

Клейн, Б. Недосказанное (главы воспоминаний) / Б. Клейн // Клейн, Б. Недосказанное. Имена / Борис Клейн. - Минск, 2008. - С. 16-120.

Корнейчик, И. Книжное обозрение / И. Корнейчик // Неман. - 2009. - № 5. - С. 187-191.

Лабовіч, А. В. Быкаў, А. Карпюк, М. Васілёк - пісьменнікі-змагары / А. Лабовіч // Наша слова. - 2005. - 21 верас. - С.8.

Лабовіч, А. Грамадзянін. Пісьменнік. Змагар / А. Лабовіч // Пагоня (Гродна). - 1998. - 30 ліп. - С. 10.

Лабовіч, А. "Мой брат быў прынцыповым чалавекам" / А. Лабовіч // Наша слова. - 2005. - 4 траўня. - С. 4.

Лабовіч, А. "Прайшла частка маёй маладосці..." / А. Лабовіч // Пагоня (Гродна). - 2000. - 13 крас. - С. 5.

Лабовіч, А. Чалавек легендарнай біяграфіі - Аляксей Карпюк [(1920 -- 1992, Гродна)] / А. Лабовіч // Пагоня (Гродна). - 2000. - 14 снеж. - С. 4.

Ляшчонак, Н. Заўтра заўсёды позна: [аб А.Н. Карпюку] / Н. Ляшчонак // Спадчына. - 1999. - №4. - С. 66-84.

Пяткевіч, А.М. Знайсці сябе сярод сваіх людзей / А.М. Пяткевіч // Пяткевіч, А.М. Старонкі спадчыны : культурнае памежжа Гродзеншчыны: працэсы, з'явы, асобы / А.М. Пяткевіч. - Мінск, 2006. - С. 118-121.

Синевич, А. Гродненская одиссея Алексея Карпюка [(1920 - 1992)] / А. Синевич // Вечерний Гродно. - 2005. - 20 апр. - С. 8.

Тычына, М. Адысея праўдалюбца: жыццё і творчасць Аляксея Карпюка / М. Тычына // Роднае слова. - 1995. - №4. - С. 15-25.

Фядута, А. Два прарокі ў сваёй Айчыне / А. Фядута // Наша ніва. - 2006. - 26 траўня. - С. 36-37.

Чыгрын, С. Аляксей Карпюк / С. Чыгрын // Ніва. - 2001. - 17 чэрв. - С. 9.

Чыгрын, С.М. Беларуская Беласточчына: гісторыка-краязнаўчыя і літаратурныя артыкулы / Сяргей Чыгрын. - Мінск: Кнігазбор, 2008. - 168 с.

Ярашчук, С. Аляксей Карпюк: лісты з фронта і на фронт / С. Ярашчук // Пагоня (Гродна). - 1999. - 13 крас. - С. 5.

# ЗМЕСТ

Прадмова..........................................................................1
Біяграфічная даведка ...........................................................2
Творы  А.Н. Карпюка..............................................................3
Выставы ў бібліятэках ..........................................................4
“Творы, якім верыш”: бібліяграфічны агляд твораў
А. Карпюка ..............................................................................4
“Быць карысным людзям”: сцэнарый вечарыны памяці з нагоды 90-годдзя пісьменніка Аляксей Нічыпаравіча
Карпюка ...................................................................................7
БІБЛІГРАФІЯ .......................................................................11

Укладальнік: Баброва Н.Ю.
Рэдактар: Свірыда Н.Р.
Камп'ютарная вёрстка і набор: Баброва Н.Ю.
Адказны за выпуск: Камарова М.А.